Гарэлік А.

# ГЕРОЙ — АРТЫЛЕРЫСТ

У музеі баявой і працоўнай славы аб'яднання "Бабруйск-дрэў" значнае месца адведзена рэліквіям Кірыла Пракопавіча Чарнова. У канцы дваццатых гадоў ён працаваў на фанерадрэваапрацоўчым камбінаце. Юнак з вёскі Амяленская Слабодка Бабруйскага раёна, якую ў той час захапіў індустрыяльны паступ Краіны Саветаў, уладкаваўся працаваць на камбінат, Адсюль і пайшоў служыць у Чырвоную Армію.

Прыроджаная кемлівасць, дысцыплінаванасць маладога чырвонаармейца былі вельмі да спадобы камандаванню. Таму невыпадкова Кірыла Чарнова накіравалі ў Харкаўскае артылерыйскае вучылішча, дзе ён дасканала авалодаў артылерыйскай справай. Пасля заканчэння вучобы Чарнова пакідаюць у вучылішчы і прызначаюць камандзірам батарэі. Праз некаторы час былы выпускнік назначаецца ўжо камандзірам вучэбнага дывізіёна.

Вялікую Айчынную вайну Кірыл Пракопавіч Чарноў сустрэў ужо вопытным камандзірам-артылерыстам. Ён прымае самы актыўны ўдзел у радзе жорсткіх баёў на розных камандных пасадах. У канцы 1943 года Чарноў у званні маёра ўдзельнічае ў бітве на Дняпры ў раёне Канёва. Чарноў тады камандаваў 29-й асобнай знішчальнай танкавай артылерыйскай брыгадай. Прыкрываючы левы фланг 47-й арміі, яго брыгада трымала абарону ў раёне Багадухаўка – Аляксандраўскі. Вораг усімі сіламі імкнуўся перарэзаць шашу, каб прарвацца ў тыл нашай арміі. Супраць артылерыстаў брыгады Чарнова фашысты кінулі 40 танкаў, некалькі дзесяткаў бронетранспарцёраў і бронемашын, а таксама шмат мотапяхоты. Групу падтрымлівалі артылерыя і мінамёты.

Камандзір брыгады сказаў: "Вораг не павінен прайсці". Трое сутак нашы артылерысты адбівалі жорсткія атакі гітлераўцаў. А потым перайшлі ў наступленне. Вораг не вытрымаў, адступіў.

Позна вечарам Кірылу Пракопавічу даставілі новы загад камандуючага арміяй: неадкладна заняць процітанкавую абарону на плацдарме на поўнач ад Канёва. Утрымаць і расшырыць плацдарм.

Задача не з лёгкіх. Брыгадзе Чарнова трэба было ў баявых умовах зрабіць 120-кіламятровы марш, фарсіраваць раку. Вялікую ролю тут адыграла франтавая загартоўка камандзіра, яго падначаленых. Яны з Кірылам Пракопавічам абаранялі Сталінград, акружалі войскі гітлераўскага фельдмаршала Паўлюса, мужна змагаліся на Курскай дузе...

Усе ведалі валявы характар камуніста Чарнова, давяралі яму. І калі неўзабаве вораг зноў вырашыў пайсці на прарыў, то байцы і камандзіры брыгады стаялі да апошняга. І зноў атрымалі перамогу.

Да канца кастрычніка 1943 года брыгада ўжо падпалкоўніка Чарнова прымала актыўны ўдзел у пашырэнні плацдарма ў раёне Канёва. За гэты час было падбіта і знішчана 29 варожых танкаў, каля паўсотні аўтамашын, шмат іншай баявой тэхнікі, а таксама больш паўтары тысячы гітлераўцаў.

За паспяховае выкананне заданняў камандавання 29-я знішчальная артылерыйская брыгада была перайменавана ў 9-ю гвардзейскую і ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга. Пазней за вызваленне Кіева на яе сцягу з'явіўся ордэн Леніна.

Высока ацаніла Радзіма асабістыя подзвігі і мужнасць камандзіра брыгады Кірыла Пракопавіча Чарнова. 24 снежня 1943 года яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля Айчыннай вайны К. П. Чарноў яшчэ шмат гадоў служыў у арміі, стаў генерал-маёрам.

**Гарэлік, А. Герой — артылерыст / А. Гарэлік // Камуніст (Бабруйск). — 1988. — 14 мая. — С. 3.**